**15 сакавіка — Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь**

# Вяршэнства права

**Прынцып вяршэнства права замацоўвае асноўны закон любой краіны. Па ім дзейнічае і развіваецца дзяржава і ўсе яе грамадскія інстытуты. У адпаведнасці з Канстытуцыяй фарміруецца заканадаўства, найвышэйшай мэтай якога ёсць свабода і незалежнасць грамадзян. Таму дзень прыняцця асноўнага закона лічыцца знамянальным і — святочным.**

***Наш карэспандэнт Ірына Тулупава звярнулася ў Нацыянальную бібліятэку краіны з тым, каб пацікавіцца, якія найвышэйшыя заканадаўчыя акты Беларусі захоўваюцца ў яе фондах.***

Намеснік дырэктара па навуковай працы і сувязях з грамадскасцю **Людміла Кірухіна** патлумачыла: Канстытуцыі, якія *дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі*, маюць сваю багатую гісторыю. У ёй выразна акрэслены некалькі этапаў.

*1529 г.* — прыняты першы Статут **Вялікага княства Літоўскага.** Яго можна лічыць Канстытуцыяй. Вядома, што ў той год Статут не быў апублікаваны і распаўсюджваўся ў рукапісных спісах. Упершыню ён быў надрукаваны ў XIX ст. Хаця ў Нацыянальнай бібліятэцы захоўваюцца менавіта друкаваныя яго тэксты (Мінскі варыянт 1960 г. і Вільнюскі — 2004 г.)

Другі Статут ВКЛ таксама быў рукапісны. Хаця досыць рарытэтнае яго выданне — Імператарскага маскоўскага таварыства гісторыі і старажытнасцей Расійскіх, што ёсць у бібліятэцы, датуецца 1855 годам. А прыняты ён быў *1 сакавіка 1566 г.*

Яшчэ адзін Статут быў зацверджаны Жыгімонтам III *у 1588 годзе*. Ён улічваў заканадаўчую базу першых двух статутаў, аднак арыентаваўся ды выкарыстоўваў дасягненні законатворчасці еўрапейскіх дзяржаў. Статут быў надрукаваны "Не обчим яким языком, але своим" — тагачасным беларускім.

**Канстытуцыя Рэчы Паспалітай,** прынятая 3 мая 1791 г., утрымлівала 11 артыкулаў, у яе распрацоўцы ўдзельнічаў нават кароль Станіслаў-Аўгуст. Навукоўцы адзначаюць яе ролю ва ўсталяванні спадчыннай манархіі. Права выбараў караля шляхтай адмянялася.

**Першая Канстытуцыя БССР** была прынятая *3 лютага 1919 года.*

Але больш запамінальнай сталася Канстытуцыя *1927 года*, якая спрыяла далейшаму развіццю саветаў і замацоўвала права карыстання ўсімі грамадзянамі роднай мовай: у дзяржаўных і грамадскіх установах і арганізацыях раўнапраўна маглі дзейнічаць беларуская, польская, яўрэйская і руская мовы. Канстытуцыі БССР прымаліся яшчэ ў 1937 і 1978 гг.

**Канстытуцыі СССР** прымаліся ў *1924, 1936, 1977* гадах.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь** прынятая Вярхоўным Саветам *15 сакавіка 1994 года*, устанавіла новую — прэзідэнцкую форму дзяржаўнага кіравання. Менавіта Прэзідэнт з'яўляецца кіраўніком дзяржавы.

У лістападзе 1996 года пасля рэферэндуму ў тэкст Канстытуцыі ўнесены змены.

17 кастрычніка 2004 года прынята Канстытуцыя з новай рэдакцыяй 81 артыкула. Ім знятая магчымасць на абмежаванне абірацца Прэзідэнтам больш за два тэрміны запар.

***З цікавых фаліянтаў: У НББ захоўваецца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года (са змяненнямі і дапаўненнямі), прынята на рэферэндумах 24 лістапада 1996 г. і 17 кастрычніка 2004 г. Тэкст паралельна друкуецца на беларускай, рускай, англійскай мовах. Яна ў пераплёце, наклад — 2000 асобнікаў.***

Такі ж варыянт, але тэкст паралельна на беларускай і рускай мовах, выдаваўся накладам 5000 асобнікаў. А выдавецтва "Амалфея" ў 2007 годзе надрукавала яшчэ 20 000 асобнікаў.